Затыдзень да Вялікадня святкуецца вербная нядзеля. Па традыцыі ў гэты дзень асвячалі ў царкве галінкі вярбы і імі ўсхваялі родных.

Не я б’ю,вярбаб’е,
Праз тыдзень - Вялікдзень.
Вярбовым дубцом,
Ды самым канцом.
Будзьце здаровы, як тая вярба,
Будзьце вясёлы, як тая вясна,
Слухайце бацькі, слухайце маці
Не забывайце ўсім памагаці,
Старэнькім, маленькім,
Ці хворым, можа,
А вам усім хай Бог дапаможа.

(Гаспадыня кранае галінкам ігасцей, якія прысутнічаюць на святе).

Пачастуем мы вярбой гасцей,
Каб хадзілі да сваіх сяброў часцей,
Каб здаровымі былі,
Многа добрых спраў рабілі.

**Танец з галінкамі**

Праз тыдзень ад Вербнай нядзелі святкавалі Вялікдзень – найвялікшы дзень. Некалі Бог паслаў на Зямлю свайго сына Ісуса Хрыста. Ён збаўляў людзей ад розных хвароб, выратоўваў ад смерці. Ён вучыў усіх жыць у згодзе, любіць адзін аднаго, дапамагаць слабым і хворым, заўсёды быць добрымі, чулымі,

спагадлівымі. Але былі людзі, якім не падабалася вера Хрыста, яго магутнасць. Сярод яго вучняў знайшоўся і здраднік. Ён данёс на Ісуса. Шмат выпрабаванняў прыйшлося перанесці Хрысту перад смерцю: страшэнны суд, здзекі,распяцце на крыжы.
Пасля смерці веруючыя людзі знялі цела Ісуса і аднеслі ў пячору, уваход заклалі вялікім каменем. Праз некалькі дзён жанчылі ўбачылі, што ўваход адкрыты, а цела Хрыста знікла.Ангел сказаў ім: “ Ён уваскрэс”.
Галоўным сімвалам свята з яўляецца яйка, якое лічылася крыніцай вечнага жыцця, прадаўжэння чалавечага роду. Яйкі фарбавалі ў чырвоны колер.
У Святым Паданні апавядаецца, што аднаго разу Марыя Магдаліна, прапаведуючы веру Хрыста, прыйшла да імператара Рыму і падаравала яму яечка са словамі: “Хрыстос уваскрэс!”. У сапраўднасці слоўсвятой Магдаліны ўладар імперыі пераканаўся на свае вочы: звычайнае яйка ў ягоных руках раптам пачало ружавець і ўрэшце стала ярка – чырвоным. З той пары мы падчас найвялікшага свята дорым адзін аднаму фарбаваныя яйкі як знак крыжовых пакут Ісуса Хрыста дзеля нашага духоўнага ўваскрэсення, як сімвал несмяротнасці такога жыцця. І пранікнёна ўсклікаем:”Хрыстос уваскрэс!- “Ваісціну уваскрэс!”

1.Голасам магутным загрымелі звоны
Па блакітным небе ў бляску сонца кос.
Палілісь урачыста радасныя тоны,
Бо Хрыстос памершы ў трэці дзень уваскрос.
2.Вецярок вясновы з радасці спявае.
Птушак пералівы імкнуцца ў вышыню,
А вясна на ліры гімн Хрысту іграе,
Гожа прыбірае краскамі зямлю.
3.І вы, людзі,ранамі Хрыстовымі
Збаўлены ад грэху, зрок узнясіце ўвысь!
Удзячнаю малітваю добраму Ісусу
Сэрцам і душою горача маліцесь.
4. Голасам магутным грымяць сёння звоны
Па блакітным небе ў бляску сонца кос.
Льюцца ўрачыста радасныя тоны,
Бо Хрыстос, наш Збаўца, у трэці дзень уваскрос.

**Песня: «Пасху радостно встречаем»** (Слова В. Кузьменкова)
1. Пасху радостно встречаем
И поём: «Христос воскрес!»
Мы все дружно отвечаем:
«Он воистину воскрес!»
Припев:
Он воскрес! Он воскрес!
Он воистину воскрес!

Он воскрес! Он воскрес!
Он воистину воскрес!

2. Всюду радость и объятья.
Брат, сестра: «Христос воскрес!»
Ад разрушен, нет проклятья,
Он воистину воскрес.
Припев тот же.
Он воистину воскрес!
Он воскрес! Он воскрес!
Он воистину воскрес!

Вядучы На першы дзень, на Вялікдзень валачобнікі збіраліся.
Вось і на наша свята завіталі валачобнікі.
Сустракайце іх.

**Антось** Вось і дачакаліся Вялікадня.
А колькі ты прысмакаў прыгатавала да яго, Васіліна!
**Васіліна** Зараз Антось будзем гасцей сустракаць і частавацца.
Ці чуеш, хтось да нас завітаў.

**Валач.**1 Ой , барамі сасновымі,
Ой, палямі жытнёвымі
**В2** Ідуць, гудуць валачобнікі,
Гукаючы, спяваючы
**В3** Валачобнікі валачыліся.
А за чый жа двор зачапіліся?
**В5** Ой, ці дома пані гаспадыня?
Васіліна Дома,дома.
**Валач.1** Валачобныя – людзі добрыя,
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы!
Валачыліся, намачыліся,
Зайшлі да бабкі – падсушыліся.
Вясна – красна на ўвесь свет.
Хрыстос уваскрэс!
**Антось і Васіліна** Ваісціну васкрэс.
Заходзьце ў хату.
**Валач.1** У гэтавялікае свята—Вялікдзень
Ды пойдзем да першага двара.
Ці запросяць да гаспадарскага стала?
З чырвоным яйкам, з цёплым акенечкам.
**Валач.2**
А мы ідзём, ідзёмпадбагаты дом,
Пад багаты дом "Дзень добры!" даём,

Дзень добры таму, хто ў гэтым даму.
Гаспадарочак, слынны паночак,
Ціспіш, ці ляжыш, ці адпачываеш?
Ці нас, валачобнікаў, дажыдаеш?
3-і валачобнік.
А ціўслыхтабенашыпесенькі?
Валачобныя, велікодныя?
4-ы валачобнік.
Каліняўслых, дык Бог з табою,
Каліўслых, гукай са мною,
Адкрывайклямачку, заві ў хатачку.
Гаспадар
Перш чымзваць,
Час ужо і песню заспяваць,
Святочныявіншаванніказаць.
**Песня "Святы дзень"**
1.Вялік святы дзень наступіў,
Ён радасць свету абвясціў:
Гасподзь уваскрос, збавіцель наш-
Хрыстос Уваскрос!(3р)
2. Жанчыны міра прыняслі
І да магілы падышлі.
Там бачаць ззянне і святло-
Хрыстос Уваскрос!(3р)
3.Жанчынам Ангел там сказаў:
"Хрыстос Уваскрос і з мертвых устаў,
Дарма шукаеце яго-
Хрыстос Уваскрос!(3р)
4.Спявайма ў цэрквах і дамах
Пра збаўцу нашага Хрыста,
Няхай гучыць урачыста скрозь
Хрыстос Уваскрос!(3р)
**Васіліна** Дзякуем за цудоўную песню.

В.1 Валачобнікі -не дакучнікі.
Не часта ходзяць, на дакучаюць
В.2 Мы прыйшлі да вас не проста так.
Хто любіць танцы, гульні, скокі
Той не будзе сумаваць!
В.3 Мы ўсіх вас запрашаем,
З намі ў гульні пагуляць.
**Песня " Чаму ж мне не пець"**
Васіліна Дарагія сябры! А вы загадкі любіце і ўмееце іх разгадваць. Зараз мы вам загадаем. А за кожны правільны адказ мы будзем даваць вам прыз.

1.Пад чарапочкам б е чорт малаточкам.(гадзіннік)
2.Не піўшы, не еўшы,крычыць ашалеўшы.(званок)
3.Сеў у вазок і паехаў у аганек.(гаршэчнік і чыгун)
4.Баба старая ўсю зіму дзяцей грэла.(печ)
5.Зароў вол на сто гор, на тысячу азер.(гром)
6.Новая пасудзіна, а ўся ў дзірках.(рэшата)
Васіліна і АнтосьМалайцы, а тыя хто атрымаў абаранкі просім да нас падысці.У каго вялікі абаранак, той будзе ў маей камандзе, а ў каго маленькі, той у маёй.Гуляць мы будзем у б.н.г. “ Запляці касу”
Вось вам тры стужкі. А вы, узяўшы кожны па стужцы, будзеце заплятаць касу.Чыя каманда хутчэй і прыгажэй запляце касу, тая і перамагла. Як музыка зайграе. Так і пачынаем.
Малайцы! Вось вам ад нас падарункі.

**Васіліна.**Адкажыце, мае даражэнькія, а якая страва абавязкова прысутнічае на святочным сталe?Правільна – яйка.
Дзеці выконваюць бел.народную песню «Чырвонае кока»
Чырвонае кока ўжо недалёка,
Каліна-маліна, ягадзіца!
Цыбульку лупіці, яечкі хварбіці,
Каліна-маліна, ягадзіца!
Яечкі хварбіці, хлопчыкам дзяліці,
Каліна-маліна, ягадзіца!

**Васіліна**Добра спявалі. А нашым гасцям спадабалася?

А зараз давайце яшчэ пагуляем.
Моц яек паспытаем.
Спачатку аб зубкі пастукаце
Да вушка прыкладзіце - паслухайце:
Каліяйкагудзе – значыцьмоцнымбудзе,
А калі не – значыць нехта разаб’е.

**Праводзіцца гульня «У біткі»**
Ну што, будзем біцца?
Будзем, але раней дай паспрабаваць.
Ой, вельмі ж тваё моцнае – пайду далей!
Дык можапамяняемся?
Не, давай тады сваімі.
ну дык трымай – буду біць!
Не, перш ты трымай – а я потым!
Сутнасць гульні ў тым, што хтосьці з вас у выніку яйкавых баёў павінен застацца з цэлым яйкам. Усё зразумела. Тады пачынайце.

Антось   Дык у каго самае моцнае яйка. Віншуем. У гэтым годзе  будзе самая моцная гаспадарка. Трымайце прыз.Сябры, давайце ушануем гэтае яйка і яго гаспадара, каб і для нас быў год багаты.Калі ласка, зрабіце вакол нас карагод – сонейка з велікодных яек. А пры канцы мацак выбера самага шчаслівага з вас. Хто жадае стаць шчаслівым? Хутчэй у карагод!
**Гаспадыня:** - Давайце і мы прывітаем сонейка і павіншуем яго СА святам.

**Выконваюць бел.нар. песню - «Свяці сонейка»**
1. Свяці, свяці, сонейка,
Каб нам было цёпленька.
  Ай, люлі, люлі. Лю-ленькі-люлі.
 2.Пад хатаю седзячы,
Лусту хлеба дзержачы.
  Ай, люлі, люлі. Лю-ленькі-лю
 3. Дзіцяткалюляючы,
Песенькі спяваючы.
Ай, люлі, люлі. Лю-ленькі-люлі.
Што ж мацак, пакажы нам самага шчаслівага.(Гаспадар мацака круціць яго на талерцы і знаходзяць самага шчаслівага чалавека).Вось каго выбрала яйка! Самы шчаслівы чалавек. Вам велікодны прыз.

**Гульня «Качанне яек»**
У старажытныя часы, каб зямелька хутчэй абудзілася ад зімовага сну,па ёй качалі яйкі. А яшчэ, качаючы з горкі, людзі маглі даведацца пра працягласць свайго жыцця. Давайце і мы выявім сярод вас доўгажыхара. Я запрашаю вас сюды ўсіх, хто жадае палічыць свае гады. Адна ўмова – яйкі з горкі трэба каціць лёгка пускаючы, і не кідаць ні ў якім выпадку. Ну а цяпер па чарзе пачынаем.
Ваша яйка закацілася найдалей. Вы – будучы доўгажыхар. Вам прыз, і не забудзьце запрасіць нас на 100- гадовы юбілей.

**Гульня «На паляўнічы спрыт»:**А мы зараз пагуляем яшчэ ў адну цікавую гульню, у якой вы прадэманструеце свой паляўнічы спрыт. Слухайце ўмову: вы па чарзе з завязанымі вачыма  павінны з трох разоў лыжкай патрапіць па яйку, якое будзе ляжаць дзесьці тут на стале.Усё зразумела. Тады пачынаем.
Тым хто пацэліць даём прыз і кажам “Дакладнасць будзе адметнай рысай ва ўсіх справах”, а тым, хто не пацэліў –“ У вас ўсё наперадзе”

**Дзеці выконваюць танец “Рэчанька”.**
Валачобнікі
Дзякуй вам гаспадары за гасціннасць.
Добра мы з вамі павесяліліся.
А нам час ісці далей.
Несці добрую навіну іншым людзям.

Хай тут сонца ярка свеціць.
Каб усё ў вас расло.
Каб вяліся ў вас дзеці
І каб гора не было.
Каб зімою было што есці.
Што надзець і у чым пайсці.
Сеяць што каб засталося
І вясною хлеб пячы.
Як кажуць у народзе:
Дай вам жыць у раскошы.
Мець торбу грошай.
Бяды не знаць ніколі.
Каб багатыя былі.
Каб дзеткі здаровыя раслі.
Ад шчырага сэрца вам долі жадаем
Ніхто з вас ніколі хай гора не знае.
Дык бывайце здаровы, жывіце багата.
А год прабяжыць-
Вы нас зноў тут чакайце.
Песня “Бывайце здаровы, жывіце багата”.
Валачобнік.
А ты, гаспадынька-журавінка,
Адары нас, не мары нас.
Валачобнік.
Дай кожнаму пеюну
Хоць па яйку,
Ну, пачынальніку дасі парачку.
Валачобнік.
Нашаму механошу – пірог з галёшу,
Ну і ў торбачку яго яшчэ смачнага чаго.
Музыка.
У музыкі горка доля:
Што даюць - бярэ і тое.
Ой, нясі, нясі, гаспадынечка,
Фарбаваныя яечкі, сыр на талерцы,
А к таму сырчыку пшонны піражок.
К таму піражку – міску тваражку.
Дзякуй усім, хто завітаў на нашае свята.
Хрысто Уваскрос!.

“ПРИЛОЖЕНИЕ Д”

# Беларуская гасцеўня “Сёння ў нашай хаце свята”

*Кіраўнік музея*
*ДУА “Красненскі вучэбна-педагагічны комплекс*
*дзіцячы сад – сярэдняя школа”*
*Мароз М.Ф.*

***Гаспадыня:*** Ой, Алесь! Колькі да нас завітала гасцей.

***Гаспадар:*** Сапраўды. Гасцей з усіх валасцей! Але ж ты не хвалюйся Ганначка, госць лавы не праседзіць.

***Гаспадыня:*** Госць нямнога бывае, да многа бачыць.*(Госці праходзяць у музейны пакой)*

**РАЗАМ: ДОБРЫМ ЛЮДЗЯМ РАДЫ БУДЗЕМ!**

Дарагія госцейкі,просім у нашу беларускую хатку.
Найбольш значнымі рытуальнымі цэнтрамі хаты з’яўляліся “Бабін кут”(нездарма казалі: бабіна дарога – ад печы да парога”) і чырвоны кут (мужчынскі).

Яна галодная-
Хата халодная ,
Яна пад’ела-
Хата пацяплела.

Ці здагадаліся вы,пра што ідзе размова?Так, гэта- печ.Яна і грэла,і карміла,і лячыла ад прастуды.Сялянскую хату нельга ўявіць без печы.Звычайна печ мясцілася на кухні,у бліжнім ад увыходу куце.Усярэдзіне печы паляць дровы,пякуць хлеб,сушать грыбы.Печ выклікала павагу ў людзей.Пры ёй нават нельга было брыдкасловіць.

Без руплівай гаспадыні
Печ не печ,а склад цаглін.
Не абсушыць,не сагрэе,
Не накорміць кожны дзень…
Есці зварыць мігам-наце,
Падрумяніць каравай.
Не,не печ,а дзеўка ў хаце,
Хоць ты замуж выдавай.

Печ-сімвал дамашняга ачага.Давайце ўявім ,як патрэскваюць дровы ў печы,як цёпла каля жоўтых языкоў полымя,як смачна пахнуць пухнатыя бліны.Голымі рукамі гаршка з печы не дастанеш,гаршчок ці чыгунок падхоплівалі знізу вілкамі і ставілі ў печ.

За печчу знаходзіўся посуд, які вырабляўся раней у асноўным з чырвонай гліны. Але ёсць збаны і чорна-дымнай керамікі. Збан і гарлач вельмі падобныя між сабою,як браты,толькі гарлач без ручкі і не мае носіка-дзюбкі зверху.

Многа рэчаў выраблена з дрэва. Напрыклад, вось гэта маслабойка з доўбленага дрэва.

Ступа. Яна сімвалізуе жанчыну. У вясельнай песні

“ Тупу, конікі, тупу
Прывязлі на двор ступу,
Не ступу – калодзіцу,
Не дзеўку – малодзіцу”.

На Масленіцу хлопцам, што не жэняцца, прывязвалі ступу да нагі і патрабавалі магарыч.Ступу выкарыстоўвалі ў медыцыне і ветырынарыі. Калі карова не жавала жвачку таўклі ў ступе лыка з хлебам і соллю і піхалі ёй у рот.

У вугал хаты гаспадынька утыркнула серп. Серп, як і іншыя металёвыя прадметы, служыў для папярэджвання і пазбаўлення ад хваробаў, найбольш характэрных для часу жніва. Праз яго прапаўзала сурочанае дзіця. Жнеям забаранялася класці серп на зямлю, перадаваць з рук у рукі.

А зараз запрашаю прайсці на покуць.

Покуць-гэта куточак храма у хаце.Уверсе,пад самай столлю, вісяць абразы.Яны маўклівай малітвай асвячаюць хату і жыццё людзей.Покуць прыгожа ўбіраецца.На абразы гаспадыня вешае ўзорныя ручнікі-набожнікі.І зімою тут залацяцца галінкі асвечанай вярбы,пучкі жытневых каласоў і зёлак.За абразамі трымаюць бутэлечку з асвечанай вадою-лекамі ад розных хвароб.

Светла было на душы,
Цешыла хата-святліца.
‘’Чалавек, не грашы!”-
Напамінала бажніца.

Ціхім,спакойным агнём,
Не ведаючы зацьмення,
Свечка гарэла і днём,
Як божае благаславенне.

Пра якія рэчы пойдзе размова далей,падкажа нам загадка:”Стаіць сасна,на сасне лён,на льне жыта”.Так,гэта стол,абрус,хлеб.

Стол-самая дарагая рэч у хаце. Ён дарагі не таму,што каштуе дорага,а таму,што кожны дзень збірае разам,аб’ядноўвае сям’ю.Таму і стаіць ён звычайна на покуці-самым пачэсным месцы ў хаце.Са сталом звязаны многія рытуальныя дзеянні.Калі быў гатовы вясельны каравай,маладую прыводзілі ў хату,і яна,атрымаўшы благаславенне бацькоў,тройчы абыходзіла са сватам

вакол стала.На стол клалі хлеб,стаўлялі свечкі,святую ваду.На стол не садзіліся і не станавіліся нагамі..

Соль і хлеб – гэта адзінае цэлае. Клішэ “хлеб – соль” наогул выкарыстоўвалася для абазначэння ежы і пачастунку. Вера ў моц солі настолькі моцная, што для нейтралізацыі чарадзейскага позірку дастаткова лічылася адно вымаўленне формулы “Соль табе ў вочы” або “Соль-пячына, да чорт з тваімі вачыма”.

Соль сыпалі ў апошнія каласы на дажынках, асвячалі ў царкве ў Чысты чацвер, каб потым выкарыстаць у народнай магіі. Соль выкарыстоўвалі нават любоўнай магіі. Таму пра вельмі закаханых казалі: “Ці не соллю іх абнеслі?” Стол як далонь Бога. Бо гаспадар частуе гасцей, чым Бог паслаў.

Пад абразамі садзіўся гаспадар, справа ад яго – мужчыны, злева – жанчыны.На стале катэгарычна забаранялася сядзець, гэта магло прывесці да жудаснай нястачы сям’і, класці на стол рэчы, не звязаныя з яго функцыяй. Напрыклад, калі на стале клалася шапка – у хаце будзе сварка, грэбень – будзе балець галава.

Сноп у абраднасці і павер’ях беларусаў надзяляўся жыватворнай, вытворчай сілай і увасабляў багацце, дабрабыт, пераемнасць.

Асабліва сакральным статусам надзяляўся першы і апошні сноп. Апошні сноп станавіўся цэнтральным атрыбутам шэрагу звычаяў і з ім у абдымку качаліся па полі, куляліся праз яго, неслі ў вёску.Сноп неслі менавіта на кут – як самае ганаровае месца ў хаце, прызначанае.

Ой,лянок,лянок мой чысты,
Валакністы,залацісты!

Лён – старажытная культура . Яго ведалі людзі тысячы гадоў назад,калі яшчэ карысталіся каменнымі прыладамі ў гаспадарцы . «Пасееш лён – збярэш золата», - кажуць людзі . Але не лёгка дастаецца чалавеку гэта багацце .

Спачатку лён трэба было пасеяць , затым палоць , ірваць ,слаць , мяць ,трапаць ,часаць ,снаваць і прасці ніткі і толькі пасля можна было ткаць .Валакно льну служыла асноўнай сыравінай для вырабу тканін . Для атрымання валакна саломку льну рассцілалі на лузе або на пожні , звычайна ў канцы жніўня ў час вялікіх рос . Валокны з мачанца лепш выбельваліся і былі больш моцныя , трывалыя . Гатовую трасту звязвалі ў кулі , сушылі . У кастрычніку яе мялі церніцай , трапалі траплом , часалі грэбенем або шчоткай . Атрыманы кужаль або кудзелю пралі пры дапамозе верацяна ці на калаўроце . Кожная вясковая дзяўчына павінна была ўмець ткаць і прасці .Перад вамі ляжаць саматканыя ручнікі , сурвэткі , посцілкі , вытканыя з любоўю і пяшчотай рукамі жанчыны . Напэўна , пагэтаму яны такія непаўторныя і прыгожыя .

Зазірнём у бабулін куфэрак. Праз куфар відаць жыццё чалавека

Надзеў на вяселле
Прыгожы жупан ,
На возле рассеўся
І едзе ,як пан .

Куфар часта згадваецца ў вясельных песнях. Дзяўчына збірала пасаг , складвала ў куфар .І калі ішла пад вянец,перавозіла куфар у хату жаніха.Рабілі куфры з дошак,па баках мацавалі ручкі.За сталярную справу браліся мужчыны,а размалёўвалі куфры жанчыны.На куфры расцвіталі кветкі,залаціліся каласы ,сінеў лён. У куфры захоўвалі тканіны,адзенне, каштоўныя рэчы .Па тым,што знаходзіцца ў куфры ,меркавалі пра ўмельства і працавітасць дзяўчыны. Аднак народ лічыў ,што багаты пасаг не заўсёды прыносіў шчасце: “Шчасце ў куфар не пакладзеш”,”Не з пасагам жыць,а з чалавекам”. Як вы бачыце,тут вельмі шмат ручнікоў.

Ручнік выконваў розныя функцыі: набожнік, уціральнік,галаўны ўбор, пакрывала і інш. Усе яны неслі адну і тую ж глыбінную сімволіку – ахову, спрыянне, добразычлівы ўплыў. Ручнік – неабходны рытуальны прадмет крышчэння. На яго кладуць дзіця пасля абраду. Без ручніка не абходзіўся ніводзін этап вяселля (абвязвалі ручніком сватоў, за ручнік вялі на пасад маладую, на ручнік садзілі, яго падсцілалі на шляху ў хату маладога і ў царкве пры вянчанні). Гэта ўяўляла пажаданне багацця, дабрабыту, а таксама далучэнне да новага дому. У пахавальнай абраднасці ручнік выступаў у ролі медыятра паміж светам жывых і светам памёрлых продкаў.

Пояс. Здавалася б , звычайная маленькая частачка традыцыйнага народнага строю. А ён, аказваецца, мае глыбокую сімволіку: некалі суправаджаў чалавека ад нараджэння да смерці, ахоўваў цела і душу.

Калі дзіця было яшчэ ва ўлонні маці, яна абвязвала жывот чырвоным пояском ад сурокаў, а калі пужалася, палец левай рукі засоўвала за пояс. Немаўля спавівалі тонкім чырвоным пояском – як бы забяспечвалі абарону ад хвароб і няшчасцяў.Да вяселля дзяўчына павінна была вырабіць сотню, а то і больш паясоў: сватам у знак згоды на шлюб; жаніху перад вяселлем разам з кашуляй і нагавіцамі; радні жаніха; павязаць цераз плячо ўсім вясельнім чынам; на дугу каня; стаць на ручнік і пояс у час вянчання,да стала маладых вялі на пояску.Лічылася, што пояс аберагае ад няшчасцяў.

Гаспадыня : Штосьці цеснавата ў нашай хаце , шмат гасцей сабралася .Чуеце,як шумна і весела на падворку. Давайце і мы туды зазірнем. ( Далей абрад “Гуканне вясны)

**Гаспадыня:**

Гэй,добрыя людзі!
Паглядзіце, што будзе!
На забаву спяшайцеся,
Ды не вельмі штурхайцеся!
Гэй,добрыя людзі!
Паглядзіце, што будзе!
Усе збіраюцца,
Свята пачынаецца!

**Гаспадар:** Шмат склалі казак, легенд, песень людзі пра сваю зямлю і пра лес свой.

Ёсць у нашага народа з даўняга часу адно паданне, якое пераходзіць ад дзядоў да ўнукаў.
Як брала вясна ў сонца ключы,
Адчыняла сырую зямельку,
Пускала на свет траву-мураву,
Адзявала у лісце бярозы.

**Дзяўчаты:** Хлопцы! Ці трэба нам Вясна – красна?
**Хлопцы:** Трэба!
**Дзяўчаты:** Ці будзем мы яе гукаць?
**Хлопцы:** Будзем!

Ці дазволіце, добрыя людзі,
Вясну клікаць,
Зіму праважаць, лета дажыдаць?

Красна сонца, ясен свет,
Угрэй, упар зямлю,
Распусці зялёную траву.

Вылеці, пчолка ярая,
Вынесі залатыя ключыкі,
Замкні халодную зіманьку,
Адамкні цёплае лецейка.

Гэй, рабяты, выходзьце,
Будзем славу Сонцу спяваць
Ды Вясну клікаць!

**Карагод «Прыйшла Вясна».**
Блаславі, Божа,
Вясну-красну пеці,
На ціхае лета,
На буйнае жыта.
**Песня «Жаваронaчкі».**

**Дзяўчаты:** благаславі, Божа, вясну гукаць, лецейка сустракаці, зімачку праганяці!

**Хлопчыкі:** Дай, Божа, на жыцечка род, на статак плод, а людзям усім здароўя!

**Дзяўчаты:** Дай,Божа, на зямельку травіцу, на травіцу-расіцу, на лясочак лісточак і вясёлы дзянёчак!

**Дзяўчаты:** Вясна наша вясёлая! Гу! Развесяліла зямлю, ваду! Гу!

**Хлопчыкі:** Ой, вясна, вясна вясёлая, нарасла трава зялёная. Гу-у-у!

**Дзяўчаты:** узвесяліла ўсе горачкі-даліначкі, дзе парабачкі, там дзевачкі. Гу-у!

**Хлопчыкі:** Ідуць парабачкі страляючы, а дзевачкі – спяваючы. Гу-у-у !

**Зіма:** Ой, чалом, чалом ды цёпла лецечка!
**Вясна:** Ой, здарова была ды халодна Зімачка!
**Зіма:** Чаму цябе велічаць. Мяне Зімачку, праклінаюць?
**Вясна:** Бо ты, Зіма, халодная,
Лугі, балоты, памарозіла,
А я, Вясна, ды вяселая.
(Чуюцца крыкі птушак).
**Хлопцы:**
З гары, Зіма, ты нядобрая была!
Адыдзі, Зіма, ты мокрай была!
Згінь, Зіма!
Пусці Вясну на зямлю!
**Зіма:** Галаву вядзе да сну
(Моц акоў маіх аслабла),
Але я вам яшчэ паспею
Адамкнуць Вясну-красну.
Вясну з прыходам вітаю
І трон ёй свій саступаю
А я ж ад'язджаю на спакой
У паўночы край любімы свой .
**(Развітальны карагод з зімою)**

**Хлопец:** прагналі Зіму, будзем Вясну славіць.
Шуміць, гудзе, Вясна ідзе,
Шчасце і радасць людзям нясе.
Ой, Вясна, Вясна,
Як жа ты красна!
Мы цябе спяваем, цябе сустракаем.
**Вясна:** Добры дзень, мае даражэнькія,
І дарослыя, і маленькія:
Усім, хто мяне чакаў,
Карагоды рыхтаваў!
Зіме – канец – Вясне пачатак!
Для нас усіх сягодня свята:
Музыка, грай! У коле вялікім
Няхай паскачуць чаравікі.
**(танец "Полька")**
**Хлопец :** Ляціце, птушкі веснавыя,
Нясіце ключы залатыя,
Адмыкайце зямліцу,
Выпускаць расіцу,
І густую, і частую,
І цёплую, і мокрую,
На ўвесь свет.

І на кожны цвет.

**Ляціць Шэрая Галачка, аблятае ўсю прастору пляцоўкі і накіроўваецца да Вясны.**

**Галачка:** Вясна, вясна, вясняначка,
Прымі залатыя ключы!
Ад роднай нашай зямлі.
**Вясна:** Гэты дар прымаю,
Усім людзям міру жадаю.
Каб усім вам сонейка свяціла,
І здароўе ўсім вам была.
**Вясна прымае ключы і разам з Шэрай Галачкай да вучняў.**

**Хлопец :** Усё Вясна старанна падлічыла
І сонцам абагрэла кожны кут.
Ідзі хутчэй, мы шчыра запрашаем, бушуй, квітней ты з намі тут!
**Хлопец** (сутракае Вясну трымаючы ў руках ручнік са збаночкам зерня)
Бяры зярно і засявай
Палёў шырокія абшары,
Хай новы дзень здабыткам будзе,
Нясе ён радасць, шчасце людзям.
**Вясна:** О,зямля!
Ты ўся ў абновах!
Ты ў мільён званочкаў звоніш.
Ты на ста пявучых мовах
Песняў – радасцю гамоніш.
Ты ўздыхнеш на поўны грудзі –
У полі будуць скібы ўзняты,
Заспявайце ж нівы, людзі,
Прымай, зямля, зярняты!
Вясна з паклонам ставіць збаночак з зернем на падстаўку.
**Шэрая Галачка:** Вясна-вясняначка,
Мы так цябе чакалі.
Вясна-галубушка,
Мы так цябе гукалі!

**Дзяўчаты**: Ой, вясна-маці!
Хадзі да нас гуляці!
Хадзі гуляці
У карагодзе скакаці!
У карагодзе скакаці
Песні спяваці!
Песні спяваці,
усіх частаваці!

**Дзяўчаткі** *(падбягаюць да Вясны).*
А ты, Вясна, а ты, красна,
Што ты нам прынесла?
**Вясна.**
А прынесла я вам цёплую вадзіцу, зямлі — травіцу, пастушкам — па кіёчку, а дзяўчаткам — па вяночку.
**Карагод з вяночкамі.**

*З'яўляюцца валачобнікі, співаюць, б'юць у бубен, свішчуць.*
**Валачобнікі.**
Ой, барамі сасновымі,
Ой, палямі жытнёвымі,

Ідуць, ідуць валачобнікі,
Гукаючы, спяваючы.

Валачобнікі валачыліся,
Валачобнікі намачыліся.

А за чый двор зачапіліся?
**В.** Ды за наш двор зачапіліся.
Валачобнікі *(ідуць да гаспадыні).*
Ой, ці дома пані гаспадыня?
**Гаспадыня.** Дома, дома.
**Валачобнікі.**
Гаспадыня, гаспадыня,
Зіма ўжо прагнана,
Адчыняй свае дзверы,
Заві нас у госці!
**Гаспадыня.** Заходзьце, добрыя людзі! Дзякуй за добрую навіну!
**Валачобнікі.**
Валачобнікі — не дакучнікі.
Не часта ходзяць, не дакучаюць,
У гэты гадочак — адзін разочак.
**Усе разам.** Частуй нас, гаспадыня, за тое, што Вясну паклікалі.
**Гаспадыня.** Каб пачаставаць, трэба спачатку заспяваць, павесяліць нас, бо без падпалу і дровы не гараць.
*Валачобнікі спяваюць прыпеўкі, усіх гасцей запрашаюць да стала., частуюць)*

**Гаспадар:**Добры звычай старадаўні
Запрашаць гасцей у дом,
Сабірацца на бяседу
за святочным, за сталом.

Мы сардэчна ўсіх вітаем,
Да застолля  запрашаем.

**Гаспадыня :**Калі на свеце нехта дзесці
Умее добра працаваць,-
То ўмее ен і смачна з'есці
І – адпаведна – згатаваць

Што смачней у цэлым свеце?
Вам адкажуць нават дзеці.
Наша бульба з чыгунка
Ды збаночак малака!

А найлепшая прысмака
Я скажу вам – верашчака!
З каўбасою ды з грыбамі,
Ды з духмянымі блінамі!

Калдун! Духмяны, самавіты,
Смятанкай свежаю паліты.
Яго так любіць беларус
І часта ставіць на абрус.

Побач- зірк! Як цуд, як казка
Ляжыць вясковая каўбаска,
Ды з каляндрай, з часначком
Таксама ўвітая дымком!

Адну страву ў Заполлі
У бліжэйшым наваколлі
Карасямі называлі
Вельмі часта гатавалі

Вам, папенкі і паны,
Прапануем квас грыбны.
Падаваўся на Каляды,
Кожны з'есці яго рады.

Хлеб – галоўнае багацце,
На пачэсным месцы ў хаце.
Ён з мясцовае закваскі,
Паспрабуйце, калі ласка!

Вось народны наш напой –

Хлеба ржанага настой.
Налілі ў цагляны гляк,
Каб трымаць цудоўны смак.

Народ беларускі, гасцінны народ.
І любіць прыгожыя святы.
Дзе столькі вясёлых, цудоўных прыгод
Дзе стол накрываюць багаты.

А стравы такія, што нашы дзяды
Калісьці яшчэ гатавалі,
Нашчадкі да нашых часоў праз гады
Рэцэпты тых страў захавалі.

Мы верым, што звычаі нашы не ўмруць
Майстэрства народа не стухне.
Няхай жа традыцыі нашы жывуць
І ў песнях, і ў святах, і ў кухні.

**Валачобнікі.** Дзякуй за пачастунак, пойдзем далей, панясем добрую навіну іншым людзям.
Жадаем, каб былі здаровымі!
Каб былі багатымі, як зямля!
Вам шчасця, долі і хлеба уволю!
Багатага ўраджаю ў новым годзе!
**Гаспадыня.** Дзякуй, ручніком усім дарога! У добры час!
**Валачобнікі.** Вясна, Вясна-красна!
Прыйшла з радасцю,
З вялікай міласцю, з цяплом, дабром.
Пра цябе мы спяём.

Вясна стаіць у цэнтры, а дзеці становяцца ў карагод з галінкамі і блакітнымі стужкамі.
**Вясна:** Вельмі мне спадабалася ў вас. Але трэба мне далей рухацца, будзіць расліны, жывёл. Абацаю кожны год да вас завітаць. А зараз прыміце мой развітальны пачастунак.

«ПРИЛОЖЕНИЕ Е»

***Сценарий концертной программы, посвящённой Международному дню инвалида в рамах мини-проекта «Радуга добра»***

*Педагог-организатор*
*ГУО «Красненский учебно-педагогический комплекс детский сад – средняя школа»*
*Головач Г.А.*

***В.:*** Добрый день дорогие друзья! Мы рады встрече с вами в этом уютном праздничном зале! А встреча наша приурочена к Международному дню инвалидов, провозглашённому 3 декабря 1992 года Генеральной Ассамблеей ООН.
***В.:*** Это день сильных и устремлённых людей, людей, начавших жизнь заново, людей, понимающих, как эта жизнь дорога, какой бы она не была! И сегодня вас пришли поздравить взрослые и дети. Мы хотим пожелать вам всем добра, счастья, терпения и взаимопонимания!
***В.:*** Пусть ваша жизнь всегда будет наполнена самыми светлыми чувствами любви, надежды и веры. Мы подготовили для вас небольшую концертную программу. А откроет её наш постоянный гость Владимир Жиров.

**Песня**

***В.:*** День инвалидов — необычный день,
Торжественный, но с отблеском печали.
Нет-нет и набежит на лица тень.
Вы у друзей такое замечали?
Вы — оптимисты, Вашего тепла
Не только вам, но и здоровым хватит!
Желаем вам здоровья, жизненной энергии, несгибаемого стремления к достижению намеченных целей. Пусть вас окружают близкие, понимающие люди!

**Песня**

***В.:*** 3 декабря - день сильных духом людей. День тех, кого не сломила судьба и определенные обстоятельства.
Поздравляем Вас!
Позиций в этой жизни не сдавайте,
Любите, и творите, и дерзайте!
Надежды, веры свет чтоб не погас!

**Песня**

***В.:*** Мы - с Вами!
Жизнь всегда прекрасна,
И каждый чем - то одарён.

Пусть будет только радость властна,
И свет надежд не побеждён.
В водовороте всех событий,
Не застонав на рубеже,
Дерзайте, веруйте, творите,
Как заповедано в душе.
Пусть будет жизнь до края полной,
Без ограничений и без бед.
И чтобы счастья и здоровья
Хватило Вам на сотню лет.

**Песня**

***В.:*** Самое главное для человека – это дружба. Без дружбы душа может погибнуть. Люди, которые умеют дружить, самые счастливые на земле. Ведь жизнь отдельного человека имеет смысл лишь в той степени, насколько он помогает сделать жизнь других людей красивее и благороднее.

**Песня**

***В.:*** Поддержка и опора нужны всем людям, без исключения. Но особо в них нуждаются люди с ограниченными возможностями. Отстаивать свои интересы, доказывать, что ты многое можешь, умеешь, гораздо легче, если с тобой единомышленники. Помните, что человек, улыбаясь, излучает добро, несет заряд положительных эмоций. Так давайте сейчас подарим друг другу улыбки! Чувствуете, как стало теплее в зале?

**Песня**

***В.:*** В каждом из нас есть маленькое солнце. Это солнце доброта. Добрый человек - это тот, кто любит людей и помогает им. «Доброта - вещь удивительная. Она сближает людей, как ничто другое, она тот язык, на котором с вами всякий захочет разговаривать. Доброта избавляет нас от одиночества, душевных ран и непрощённых обид. Мы больше приобретем, чем отдадим, если будем чаще вспоминать про то, что человек становится человеком только благодаря другому человеку». Спешите делать добрые дела. Об этом Гете сказал так: «Не часто людям дается повод для таких высоких дел! Спешите творить добро!»

**Песня**

***В.:*** Хочется крикнуть людям:
Будьте щедрей на ласку,
Путь человека труден,
Мало похож на сказку .
В мире без ласки, знайте, —
Слезы, дожди, морозы.
Взрослым и детям, знайте, -

Ласка нужна, не угрозы.
Стремитесь открыть хоть однажды
Звезду человечности в каждом.

**Песня**

***В.:*** Дорогие друзья! Желаем вам, чтоб вы не падали духом, ставили перед собой определённую цель и добивались её, пусть это будет даже самое элементарное дело, но это уже будет ваше достижение, ваш успех! Удачи вам, уважения и помощи со стороны окружающих вас людей!
Пусть всегда для вас будет
Утро — добрым,
День — радостным,
Вечер — приятным,
НОЧЬ — СПОКОЙНОЙ,
Жизнь всегда счастливой!
Встречаем аплодисментами

**Песня**

***В.:*** Что нужно для того, чтобы каждый день у вас было хорошее настроение, чтобы болезни проходили мимо, чтобы скука и печали не разъедали ваши сердца? Совет прост – пойте, пойте песни старые и новые, всегда и везде.

**Песня**

***В.:*** День 3 декабря не зря внесён в календарь, и пройти мимо него значит упустить очень важные моменты нашей жизни. Международный день инвалидов напоминает всем о нуждающихся в поддержке и помощи, но в тоже время мужественных, крепких духом людях, проявляющих таланты в профессиональном мастерстве, изобразительном, самодеятельном творчестве, спорте. Этот день очень нужен нашему обществу - и для того, чтобы обратить внимание на проблемы людей с ограниченными возможностями, и для того, чтобы восхититься необыкновенной силой духа, целеустремленностью, умением инвалидов добиваться успеха в сложнейших условиях. Эти проявления жизнелюбия и оптимизма могут служить примером для всех нас.
Ещё раз поздравляем вас , здоровья вам и оптимизма! Огромное спасибо вам за внимание! До новых встреч!

«ПРИЛОЖЕНИЕ Ж»

**Паседжанне штаба дзіцячых і маладзёжных сацыяльных ініцыятыў “Перспектыва”**

**“Будучыня Беларусі пачынаецца з нас”**

*Педагог-арганізатар*
*ДУА “Красненскі вучэбна-педагагічны комплекс*
*дзіцячы сад – сярэдняя школа”*
*Галавач Г.А.*

Фанфары
1.Добры дзень паважаныя госці, настаўнікі і вучні!
2. Добры дзень, паважаныя сябры!
1. Мы пачынаем паседжанне штаба дзіцячых і маладзёжных сацыяльных ініцыятыў “Перспектыва”. У рабоце нашага паседжання прымаюць удзел сацыяльныя партнёры :
начальнік Аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Карэліцкага райвыканкама Іна Міхайлаўна Санчук,
галоўны рэдактар раённай газеты "Полымя" Іна Іосіфаўна Лейка,
дырэктар Карэліцкага краязнаўчага музея Т.В. Сянюта,
першы сакратар райкама ГА «БРСМ» Пархамовіч Яўгеній Андрэевіч
2. Сёння мы павінны вызначыць шляхі далейшага супрацоўніцтва ў рамках інавацыйнага праекта.
1. Мы, маладыя,адказныя за сваё будучае і за будучае краіны, дзе жывём і будзем працаваць, дабівацца поспехаў! Будучыня Беларусі пачынаецца з нас!
2. У свеце шмат розных краін, але здаўна так павялося, што чалавек, дзе нарадзіўся, да таго месца асаблівую любоў і ласку мае.

**Фотарад (гучыць песня “Беларусь”)**

**1.** Хіба можна кут не любіць,
Дзе твае нарадзіліс бацькі,
Дзе жыццё пражылі дзяды,
Дзе спрадвеку твае карані?

**2.**Любы край Беларуссю завецца,
І няма за яго мілей.
І старым, і малым тут утульна,
З кожным годам жывецца мажней.

1.Мы ўдзячны свайму прэзідэнту
За ўпэўненасць у заўтрашнім дні,
За падтрымку і клопат бацькоўскі,

За блакіт нябёс у вышыні.

**2.**Мы – нашчадкі Вялікай дзяржавы,
На Зямлі выбіраем спакой.
Любая наша Радзіма,
Заўжды будзь прыгожай такой!

1.Немагчыма ведаць сваю Радзіму, калі не ведаеш, чым жыве твой родны кут, якія працавітыя і адданыя роднай зямлі людзі жывуць побач з табой.

2. Як бы не змяняўся час, заўсёды быў і застаецца ў пашане чалавек працы.

1. Такіх людзей сустрэнеш не паўсюды
Такіх людзей - шукаць, шукаць,
А як сустрэнеш - не забудзеш
І будзеш прыклады з іх браць.

2.Такія людзі сваёю працай сплятаюць шчасце, не заўважаючы бег гадоў. Праца гэтых людзей ўсяляе пачуццё ўпэўненасці ў будучыню Беларусі, а таксама гонару за беларускі народ.
1. Ужо колькі дзесяцігоддзяў побач з намі жыве і працуе на роднай зямлі сапраўдны яе гаспадар. І сёння ў нас у гасцях кіруючы участкам № 1 СВК «Маяк-Заполле", наш зямляк, Іван Пятровіч Гавака.
2. 26 снежня 2017г. на цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка адзначыў лепшых у прафесіях і самыя эфектыўныя працоўныя калектывы. Ордэнаў, медалёў і ганаровых званняў удастоены 40 прадстаўнікоў Узброеных Сіл, прамысловасці, грамадзянскай авіяцыі, адукацыі, мастацтва і спорту. Адзін з іх - Іван Пятровіч.

2.За 40 гадоў работы на красненскай зямлі Іван Пятровіч ведае кожны каменьчык, кожны ўзгорачак. Хаця прапановы былі заманлівыя, можна было і з’ехаць, але не такі ён чалавек, за пасадамі ніколі не гнаўся. Разумеў: усюды трэба працаваць, прыносіць карысць Радзіме, атрымліваць аддачу.

Інтэрв’ю

- Іван Пятровіч, калі вы вырашылі звязаць сваё жыццё з працай на зямлі і чаму?
-Якімі якасцямі павінен валодаць чалавек, каб дабіцца поспехаў у такой складанай рабоце земляроба?
- Якія саветы вы можаце даць нам, будучаму пакаленню?

2.Аб нашым земляку мы можам сказаць: «Справамі прыгожы і слаўны чалавек!»

1.І сёння мы ўдзячны вам за доблесць і працу, мужнасць і адвагу, за тое, што вы,  не шкадуючы сіл, шчыра працуеце на карысць роднага краю і роднай краіны.  Вы сталі яскравым прыкладам для нас! Дзякуй вам вялікі! (падарунак)

2. Маладосць – гэта вялікі дар прыроды! І як распарадзіцца гэтым багаццем – залежыць толькі ад нас!
1. Дзеці і моладзь мінулага – гэта нашы бацькі і дзяды. Нам ёсць, кім ганарыцца і з каго браць прыклад!
2. І мы гатовыя да новых здяйсненняў, таму што …
Мы!

2.Маладыя і мэтанакіраваныя!

Мы!

1.Актыўныя і вясёлыя!

Мы!

2.Энергічныя і крэатыўныя!

1. У нас розны ўзрост,

2.Рост

1. Колер вачэй

(усе) Але ў нас адна мэта!

2. Мы маленькія

1. І вялікія

(разам) Патрыёты сваёй Радзімы! Мы – грамадзяне сваёй краіны!

2. Ужо на дадзеным этапе  мы зрабілі шмат добрага на карысць сваёй школы і Маленькай Радзімы і зараз аб гэтым вам раскажам!

Мы рабяты- беларусы
З васільковымі вачыма.
Хоць малыя, але знаем:
Беларусь – наша Радзіма.

Працаваць нам цэлы год
Вельмі падабалася,
Паглядзіце вы цяпер,
Што ў нас атрымалася.

Нашу справу мы назвалі
Беларускасцю ва ўсім,
І ў праектах працавалі,
Не стаміліся зусім.

Дружа клумбы мы саджалі,
Планавалі, замяралі,
Вось нарэшце братцы тут
Атрымаўся ў нас салют.

Напісалі гучна словы
Беларускай нашай мовы.
Ёй у любові прызнаёмся,
Беларусамі завёмся.

“Упрыгожым Радзіму кветкамі”

2. Я вядома, школьная тэрыторыя - цікавы аб'ект для развіцця мастацкага густу, творчых здольнасцяў, членамі ШДМСІ "Перспектыва" было прынята рашэнне аб стварэнні сацыяльнага праекта «Упрыгожым Радзіму кветкамі». У нас узнікла ідэя стварэння кветкавых кампазіцый патрыятычнага зместу на тэрыторыі ўстановы. У маі 2017г. сумеснымі намаганнямі былі зробленыя кветкавыя кампазіцыі «Я люблю Беларусь», «Салют Перамогі», «Карта маёй краіны».
Вось другое планавалі:
Гімн на плошчы мы спявалі.
Каб гучаў увесь прастор,
Быў тут ветэранаў хор

“Слаўся зямлі нашай светлае імя”

У праекце “Слаўся зямлі нашай светлае імя” мы асаблівую ўвагу надалі гімну Рэспублікі Беларусь. Праслухоўванне і выкананне гімна - гэта асаблівая хвіліна ў жыцці кожнага чалавека. Вельмі важна яшчэ і дэманстраваць адпаведнае паводзіны. Членамі штаба была прапанавана ідэя аб правядзенні школьнага конкурсу на лепшае выкананне гімна класнымі калектывамі. Падрыхтоўка да конкурсу, якая доўжылася каля месяца, была больш сур'ёзнай, чым мы чакалі. Натхніўшыся ўбачаным, мы вырашылі пайсці далей - выканаць гімн на плошчы ў аграгарадку Краснае. 15 сакавіка 2017г. сумесна з работнікамі СВК «Маяк - Заполле», сельвыканкама, СДК, хорам ветэранаў працы Карэліцкага раёна на пляцоўцы перад сельскім домам культуры адбыўся флэш-моб, прысвечаны Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Да гэтага свята мы разам - і дзеці, і дарослыя - выканалі галоўную песню краіны - Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь.
Для наступнае ідэі
Працавалі мы ў музеі,
І былі ўсім да згоды
Юныя экскурсаводы.

Мы пракладвалі маршруты
Ад сяла да Горнай Руты.

З розных школ гасцей вазілі,
Квэсты розныя рабілі,
А падтрымкаю ідэй
Быў Карэліцкі музей

“Забытымі сцяжынкамі Карэліччыны"

Намі распрацаваны яшчэ адзін праект - "Забытымі сцяжынкамі Карэліччыны", які рэалізоўваецца членамі клуба «Спадчына», і ШДМСІ "Перспектыва". Праект прадугледжвае распрацоўку турыстычных маршрутаў і экскурсій па мала вывучаным мясцінах Карэліцкага раёна. Акрамя правядзення экскурсій нашымі экскурсаводамі была створана квэст-гульня. Гэты праект рэалізаваны сумесна з раённым краязнаўчым музеем. Ужо распрацаваны турыстычны маршрут агр. Краснае - в.Лясок - г.п.Карэлічы (воз.Быкава, бровар, мемарыяльны комплекс «Зорка») - в.Паланая - в.Горная Рута - в.Дольная Рута - агр. Краснае. Удзельнікамі сталі вучні СШ№1, СШ№2 г.п.Карэлічы.

У апошнюю суботу
Года навучальнага
Пачынаем мы работу
Фестывалю танцавальнага.

Дом культуры, Дом рамёстваў -
Выступленняў было мноства,
А дэвізам фестывалю
Словы важныя гучалі:
Беларусі ў новы час
Будучыня будзе з нас!

Танцы нашага двара”

1.Яшчэ адной важнай справай з’яўляецца рэалізацыя праекта “Будучыня Беларусі пачынаецца з нас”. З 2016г. у апошнюю суботу мая на базе нашага ўстановы адукацыі праходзіць міжшкольны творчы фестываль «Танцы нашага двара». Фестываль заклікаяны прыцягнуць моладзь у танцавальны рух. Актыўныя і ініцыятыўныя члены ШДМСІ "Перспектыва" паказваюць падлеткам, што для добрага настрою не патрэбныя алкаголь і наркотыкі. Сэрца юнакоў і дзяўчат павінны аб'ядноўваць музыка і бязмежная вера ў сябе. Пастаяннымі ўдзельнікамі фестывалю сталі каманды ад СДК, ЦТДіМ, Карэліцкага дома рамёстваў. Наша ўстанова адукацыі прадстаўлялі юныя чэрлідэраў. Мы спадзяемся, што ў выніку актыўнага ўдзелу каманд з іншых устаноў адукацыі раёна наш фестываль будзе больш маштабным.

Важная стратэгія -
Наша рэдкалегія.
І пытаннем бы задацца:

Дзе мы будзем друкавацца?

У дапамогу нам на гэта
Наша школьная газета.
Фотаздымкі, справаздачы,
Замалёўкі і задачы,
Што зрабілі і што будзем,
Давядзём аб гэтым людзям.

Дэманстрацыя газеты

Якое цікавае і разнастайнае школьная жыццё! Гэта маленькая краіна, у якой не так-то проста ўсачыць за патокам падзей, а тым больш захаваць у памяці самыя незвычайныя, цікавыя і важныя моманты. Для гэтага у 2011 годзе група старшакласнікаў вырашыла арганізаваць выпуск школьнай газеты "ДэМаС", якая заўсёды была марай хлапчукоў і дзяўчынак, настаўнікаў і бацькоў. Наша рэдкалегія зусім юная, але за гэтыя гады мы шмат чаму навучыліся і гатовыя падзяліцца сваімі поспехамі і цікавым школьным жыццём.

А далей вам раскажу,
Выйшлі дружна за мяжу.
Усе абдумалі шляхі,
Ну а выхад быў такі.

З Пецярбургам мы братэрскім
Падзяліліся майстэрствам,
Доўга гутарку вялі,
Так сяброў сабе знайшлі.

Для паспяховай рэалізацыі праекта мы наладзілі кантакт праз інтэрнэт (сродкамі праграмы Скайп) з калегамі за мяжой. З мэтай абмену вопытам работы быў наладжаны тэлемост са школай г.Санкт – Пецярбурга. Размова адбылася з класным кіраўнікам 5 класа, настаўніцай геаграфіі Святланай Яўгеньеўнай і яе вучнямі. У ходзе гутаркі удзельнікі штаба "Перспектыва" расказалі аб тым, якія праекты былі рэалізаваны за два гады інавацыйнай дзейнасці, чым жыве наша сельская школа, спыталі, якія знакавыя мерапрыемствы па фарміраванні грамадзянскай ідэнтычнасці праходзяць у іх установе адукацыі. Гэты вопыт для нас аказаўся станоўчым. Дыялог атрымаўся канструктыўным, цікавым, таму ў перспектыве наладжванне зносін з нашымі суайчыннікамі, якія жывуць на тэрыторыі ЗША. Гатовыя да дыялогу з намі Святлана Гарцэла, якая пражывае ў горадзе Чыкага і працуе настаўнікам у школе, і Святлана Шутцэ, якая пражывае ў Германіі.

Не было прыемней справы
Гатаваць на свята стравы.

Да спадобы быў усім наш
Школьны восеньскі кірмаш.

Квас грыбны, аладкі, вушкі,
Клёцкі з мясам і галушкі,
Бабка з бульбы, агуркі -
Стол вось быў у нас такі.

Вучнёўскім і педагагічным калектывам быў арганізаваны і праведзены Тыдзень нацыянальнай культуры. Кожны дзень меў асаблівую тэматыку: Дзень музыкі, Дзень народных промыслаў, дзень беларускага тэатра і г.д. Вялікую падтрымку ў правядзенні гэтага тыдня нам аказалі нашы сацыяльныя партнёры - работнікі Красненскага дома культуры.

А надзейная апора -
Сацыяльныя партнёры .
Дапамога і парада -
Усё было, сябры, да ладу.

Паважаныя сацыяльныя партнёры! Мы ўдзячныя вам за падтрымку. Дзякуючы вам мы пераадолелі ўсе цяжкасці пачатковага этапу нашага інавацыйнага праекту. Ваш вопыт дапамог нам адкрыць новыя гарызонты. Мы шчыра зацікаўлены ў працягу супрацоўніцтва, жадаем вам цяпла, здароўя і любові!

А для іншых школ раёна,
Што напрацавалі плённа,
Прапаноўваем удзел
У нашым пёстрым коле дзел.

Далі слова – і трымаем,
І дзяржаву падтрымаем.
Да ўсяго заўжды гатовы,
Шмат праектаў будзе новых!

1. Мы ганарымся тым, што наша Радзіма
Разам: Беларусь!
2.Мы - будучыня нашай Радзімы
3. І мы павінны зберагчы нашу спадчыну,
4. Мір на зямлі,
5. Наша нацыянальнае багацце,
6. Жыць і тварыць,
7. Дарыць дабро людзям!

(прэзентацыя новых праектаў)

На сучасным  этапе развіцця камп'ютэрных тэхналогій  кожны чалавек мае ў кішэні доступ да любой інфармацыі ўсяго свету. Але мы не заўважаем тых, хто знаходзіцца побач з намі. Наша грамадзянская пазіцыя – дапамагчы тым, каму патрэбна наша дапамога.

У наступным годзе мы прапаноўваем расшырыць праекты "Будучыня Беларусі пачынаецца з нас" і "Упрыгожым Радзіму кветкамі"  новымі  міні-праектамі (Схема 1).
У рамках першага міні-праекта **"Тэрыторыя дзяцінства"** мы прапаноўваем арганізаваць  дзіцячы дасуг у час летніх канікул. Мы плануем правядзенне выязных забаўляльных і праграмы ў іншыя УА, вёскі, дзе пражываюць нашы навучэнцы, розныя аперацыі па  добраўпарадкаванні месц пахаванняў і інш. У гэтай справе нам неабходна падтрымка Красненскага дома культуры і ЦТДзіМ.
У рамках другога міні-праекту **"Радуга дабрыні"**  мы плануем наладзіць зносіны з дзецьмі-інвалідамі і адзінока пражываючымі людзьмі. Нам патрэбна азірнуцца вакол сябе і звярнуць увагу на тых, каму сапраўды неабходны падтрымка, добрае слова, чалавечая цеплыня, неабыякавасць. Тым больш, што ў нас ужо маецца такі станоўчы вопыт. Ужо які год мы наведваемся ў дзіцячы прыют вёскі Палужжа з навагодняй віншавальнай праграмай, запрашалі выхаванцаў на святы ў нашу ўстанову адукацыі. У мінулым годзе  мы супрацоўнічалі з Цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Карэліцкага раёна.
Трэці міні-праект "**Дзень адзіных дзеянняў**"  дазволіць нам рэалізаваць свае творчыя здольнасці і праявіць сацыяльную актыўнасць праз праз работу валанцёраў. Кажуць, што маладое пакаленне не адрозніваецца выхаваннем і не прывучана да працы, але гэта не заўсёды так. Сярод нас ёсць добрыя і спагадлівыя падлеткі, якія могуць прыйсці на дапамогу ў цяжкую хвіліну. Мы прыцягваем ўвагу не толькі вучняў нашай школы, але і жыхароў аграгарадка да праблемы экалогіі родных мясцін, аказання дапамогі пажылым людзям. Для рэалізацыі дадзенага міні-праекту нам неабходна партнёрства БРСМ, Красненскага сельвыканкама.
Чацвёрты міні-праект **"Дворык дзяцінства"** прадугледжвае добраўпарадкаванне дзіцячай пляцоўкі. Мы плануем распрацаваць макет будучага гульнявога асяроддзя "У краіне казачных гномаў".

Падводзяцца вынікі, прымаюцца вылучаныя прапановы.

## Парк дзіцяча-дарослых ініцыятыў

Мы пакаленне, якое стала сведкамі нараджэння 21 стагоддзя,  грамадзяне Рэспублікі Беларусь. Мы маладыя і ініцыятыўныя, поўныя сіл і новых ідэй. Але для таго, каб увасабляць у жыццё нашы ідэі, каб быць карыснымі Малой Радзіме, нам так неабходна ваша падтрымка, паважаныя дарослыя. Пагэтаму

сёння пачынае работу парк дзіцяча-дарослых ініцыятыў. Мы з радасцю запрашаем вас прыняць удзел у распрацоўцы макетаў нашых праектаў. На працягу занятка будуць працаваць тры групы. Пасля заканчэння кожная група прадставіць свой праект.

**Праект “Дворык дзяцінства”**

Як вядома, тэатр пачынаецца з гардэроба, а школа са школьнага двара. Таму што двор - гэта візітная картка школы. Намі сумесна з дарослымі было прынята рашэнне аб стварэнні сацыяльнага праекта «Упрыгожым Радзіму кветкамі». У нас узнікла ідэя стварэння кветкавых кампазіцый патрыятычнага зместу на тэрыторыі ўстановы. У маі 2017г. сумеснымі намаганнямі былі зробленыя кветкавыя кампазіцыі «Я люблю Беларусь», «Салют Перамогі», «Карта маёй краіны». У гэтым годзе мы захацелі прадоўжыць праект. Наша школьная тэрыторыя досыць вялікая, таму тут ёсць дзе развіць нашы творчыя здольнасць. Да году Малой Радзімы мы вырашылі зрабіць штосьці карыснае для самых маленькіх яе жыхароў – выхаванцаў дзіцячага сада і вучняў пачатковай школы. У нас узнікла ідэя міні-праекта “Дворык дзяцінства”, які будзе чымсьці падобны на казачны горад, які насяляюць такія ж казачныя жыхары. Але наш дворык павінны быць не толькі прывабным, але яшчэ і карысным. Для гэтага мы звярнуліся з нашымі прапановамі да дарослых, каб тыя параілі нам, што з пункту погляду методымі можна размяшчаць на пляцоўцы, а што не. Вось што ў нас атрымалася. Дзіцячая пляцоўка будзе падзелена на спецыяльныя зоны, кожная з каторых будзе адзначана ўказальнікам.

*Першая зона* - *“Горад добрых гномаў”* – будзе прадстаўляць сабой невялікае паселішча казачных жыхароў, хаткі якіх будуць зроблены з драўляных калод. Калоды мы плануем аздобіць штучнымі акенцамі, дах зробім з саломы або трасніку. Гэтую ідэю мы ўбачылі ў Інтэрнэце на адным з сайтаў па садоўніцтве. Гэту пляцоўку можна выкарыстоўваць для правядзення ралявых гульняў.

У нашым казачным горадзе будзе прычал, з якога адпраўляюцца караблі. Таму наша *другая зона – “Мэтеапляцоўка”*. На дзіцячай пляцоўцы можна не толькі гуляць, але і займацца некаторымі даследаваннямі: вызначаць напрамкі ветру, назіраць за дажджом, сонцам. Для пачатку тут ужо маецца карабель. Мы прапаноўваем змайстраваць побач палубу і штурвал, каб кожны мог адчуць сябе першаадкрывальнікам няведамых зямель. На пляцоўцы мы ўстановім сонечны гадзіннік, флюгер, ветраны рукаў.

*Трэцяя зона – “Заалэнд”*. У нашым казачным горадзе абавязкова будзе заапарк. У нас ужо ёсць зебра, да якой мы падселім жырафа, вусеня, жабу. Вусеня мы зробім з драўляных спілаў, жырафа – з дрэва, а жабу – з жалезнага вядра і эмаляванага таза. Усё гэта будзе пафарбавана ў адпаведны колер. Тут жа, каля дрэва, мы прапаноўваем зрабіць пчалярню – з пластыкавых бутылак. Пчаліныя хаткі будуць вісець на дрэвах. Зімою гэтыя хаткі могуць служыць кармушкамі для птушак.

*Трэцяя зона – “Паравоз з Рамонкава”*. Калісьці зроблены драўляны паравозік страціў сваю актуальнасць. У мінулыя гады вагоны засаджвалі кветкамі і ніякай

практычнай значнасць ён не меў. Мы прапаноўваем перарабіць кабіну паравозіка, каб дзеці маглі сядзець і кіраваць ім.
Як мы гаварылі раней, усе элементы ў нашым горадзе будуць пазначаны ўказальнікамі. Вос гэтыя ўказальнікі прывядуць вандроўнікаў да наступнай пляцоўкі "*Упрыгожым Радзіму кветкамі*". Зробленая намі кампазіцыя патрабуе новых дызайнерскіх рашэнняў. У мінулым годзе ў літарах мы высадзілі агератум, што прывяло да нечаканага. На перапоўненай перагноем глебе расліна моцна вырасла і зрабіла слова "Беларусь" слабачытаемым. У гэтым годзе мы плануем высадзіць штосьці больш нізкарослае. Акрамя эстэтычнай значнасці, гэта кветкавая кампазіцыя мае і практычную: старэйшыя вучні могуць даглядаць за пасадкамі, а выхаванцы – назіраць і развівацца.
Яшчэ адным элементам нашага праекту будзе *экалагічная сцежка* – спецыяльна абсталяваны маршрут, пракладзены сярод прыродных ландшафтаў. У час праходжання маршруту дзеці будуць знаёміцца з дрэвамі, раслінамі, насякомі, якія будуць ім трапляцца на шляху. На тэрыторыі нашай школы пасаджана шмат разнастайных раслін: туя, ціс, сасна, бэз, спірэя, айва, іва, лаванда, ядловец, розы, елкі. Усё гэта – вялікі патэнцыял для расшырэння кругагляду.
Разам з выхавацелем мы распрацавалі яшчэ і цэлы агарод, які будзе складацца з некалькіх участкаў: агародніна, расліны – барометры і араматычныя расліны.
А зараз мы прапаноўваем вам сумесна зрабіць макет нашага праекту. Магчыма, ў вас таксама ёсць прапановы, таму мы з радасцю іх прымем.

*Выраб макета*

**Праект "Тэрыторыя дзяцінства: дзеці "неперспектыўных" вёсак"**

Ці лёгка быць маладым? Людзі розных пакаленняў адкажуць па-рознаму. А ці лёгка быць маладым цяпер? Ужо зараз мы заўважаем шмат праблем, з якімі сутыкнуліся нашы аднагодкі. Адна з самых галоўных – гаджэты. Некаторыя проста "завісаюць" у соцсетках і інтэрнэце, што без іх сваё жыццё ўжо не ўяўляюць. Мы не лічым гэта модным, таму што дзяцінста хутка скончыцца і нічога цёплага ты не застанецца ў памяці. Усё гэта пагаршаецца яшчэ і тым, што ўсе мы дзеці з вескі, дзе жыццё праходзіць вельмі ціха. А так хочацца чагосьці вясёлага. Таму да нас прыйшла ідэя стварэння праекту "Тэрыторыя дзяцінства". Мы прапаноўваем арганізаваць дзіцячы дасуг у час канікул. Мы плануем правядзенне выязных праграм для дзяцей іншых вёсак. У гэтай справе нам неабходна падтрымка Красненскага дома культуры і ЦТДзіМ.
Сёння мы запрашаем вас скласці разам з намі лэпбук нашага праекту. Што такое лэпбук? Лэпбук – гэта кардонная папка, у якой сабраны матэрыял на пэўную тэму, якую мы хочам прапрацаваць. Матэрыял цікава афармляецца ў выглядзе міні-кніжак, кішэнь, акенцаў, кніжках-гармонікаў, скрынках з падарункамі і т. п. Таксама лэпбук абавязкова ўключае ў сябе розныя творчыя заданні. Мы сабралі шмат матэрыялу для правядзення выязных праграм. Наша задача – умела яго структурыраваць. Наш лэпбук зроблены ў выглядзе нашага школьнага аўтобуса. Гэта своеасаблівы вясёлы аўтобус, які прывязе яго пасажыраў у краіну дзяцінства.

**Праект "Каляндар дзён адзіных дзеянняў"**

На сучасным этапе развіцця камп'ютэрных тэхналогій кожны чалавек мае ў кішэні доступ да любой інфармацыі ўсяго свету. Але мы не заўважаем тых, хто знаходзіцца побач з намі. Наша грамадзянская пазіцыя – дапамагчы тым, каму патрэбна наша дапамога. Каляндар дзён адзіных дзеянняў дазволіць нам рэалізаваць свае творчыя здольнасці і праявіць сацыяльную актыўнасць, бо сярод нас ужо ёсць валанцёры. Кажуць, што маладое пакаленне не адрозніваецца выхаваннем і не прывучана да працы, але гэта не заўсёды так. Сярод нас ёсць добрыя і спагадлівыя падлеткі, якія могуць прыйсці на дапамогу ў цяжкую хвіліну. Мы прыцягваем ўвагу не толькі вучняў нашай школы, але і жыхароў аграгарадка да праблемы экалогіі родных мясцін, аказання дапамогі пажылым людзям. Для рэалізацыі дадзенага міні-праекту нам неабходна партнёрства БРСМ, Красненскага сельвыканкама.
Сёння мы запрашаем вас скласці разам з намі ментальную карту праекта. Што такое ментальная карта? Ментальная карта (інтэлект-карта) – гэта спосаб структурыравання інфармацыі, дзе галоўная тэма знаходзіцца ў цэнтры ліста, а звязаныя з ёй паняцці – па баках. Упершыню тэхніку ментальных карт прапанаваў брытанскі псіхолаг у сувязі з тым, што чалавечы мозг лепш успрымае інфармацыю цалкам, як бы скануючы. Вы заўважылі самі, што прывычныя кіламетры тэксту хутка стамляюць. Ёсць некалькі дэталей, на якія неабходна звярнуць увагу перад складаннем ментальных карт: яркія фарбы, асаблівыя стылі, сістэма абазначэнняў, выявы, дадатковыя заметкі, дакладнасць.

Паважаныя дарослыя! Мы дзякуем вам за падтрымку і дапамогу, за магчымасць ўвасабляць у жыццё нашы ініцыятывы і быць карыснымі малой Радзіме.

"ПРИЛОЖЕНИЕ 3"



“ПРИЛОЖЕНИЕ И”

**Канспект факультатыўнага занятку “Правілы ў маім жыцці” 4 кл.**

*Настаўнік пачатковых класаў*
*ДУА “Красненсківучэбна-педагагічны комплекс*
*дізячы сад – сярэдняя школа”*
*Рабко І.Г.*

**Тэма: Міласэрнасць. Аказанне пасільнай дапамогі пажылым і малодшым дзецям.**

**МЭТА:** стварэнне ўмоў для фарміравання прадстаўленняў дзяцей аб дабрыні і міласэрнасці як аб каштоўнай якасці чалавека

**ЗАДАЧЫ:**

- вучыць навыкам групавога ўзаемадзеяння, умення працаваць у камандзе;
- развіваць у навучэнцаў лагічнае мысленне, уяўленні і ўвагу;
- садзейнічаць асваенню правіл клопату пра акружаючых.

**Форма правядзення:** квэст

**Матэрыял і абсталяванне:** ноутбук, карткі з заданнямі, плакат з дрэвам, куфэрак, ацэначныя лісты, маршрутныя лісты.

**Ход занятка**

**1.Матывацыйны настрой**

***(Пад песню****«Дарогаю добра» (словы: Энцін Ю., музыка: Мінкоў М.) дзеці заходзяць у клас і рассядаюцца паўкругам)*

**Настаўнік :** Добры дзень, дарагія дзеці і дарослыя!

Пад словы якой цудоўная песні вы зайшлі ў клас? Як вы думаеце, чаму менавіта гэта песня прагучала? (*мяркуемыя адказы дзяцей - напэўна сёння мы таксама пройдзем дарогаю дабрыні і міласэрнасці*)

У жыцці па-рознаму можна жыць –
Можна ў бядзе, а можна –у радасці,
Своечасова есці, своечасова піць,
Своечасова рабіць гадасці.
А можна так:
На світанні ўстаць –
І, марачы аб цудзе,
Рукою абпаленай сонца дастаць
І падарыць яго людзям.

Сёняшні наш занятак пройдзе ў незвычайнай форме квэсту. А дапаможа нам у рабоце Дзіма і яго каманда – гэта нашы старэйшыя сябры. Яны будуць з’яўляцца праваднікамі у гульні, сачыць за правільнасцю выканання заданняў.

**2. Квэст**

**(Далей гульню вядуць Дзіма і яго каманда).**

**Дэвіз “Спяшайся рабіць дабро – ты ў адказе за гэты свет!”**

Каб аб'яднацца ў каманды і даведацца яе назву патрэбна скласці з пазлаў карцінку.
**Першая каманда** "Кропелькі міласэрнасці"
**Другая каманда** "Праменьчыкі надзеі"
Дзіма праводзіць інструктаж:

1.Кожны з вас уключаны ў каманду. Ваша задача –сумесна і паслядоўна выконваць заданні.У выніку работы вы зможаце сабраць пазл, у якім схаваны малюнак, які мае дачыненне да тэмы нашай гульні. Гэта і будзе інтрыга гульні.

2.Фрагменты пазла вы будзеце атрымліваць па выніках выкананых заданняў. Вынікі вашай работы будуць фіксіравацца ў ацэначным лісце.

3.Ацэньваецца разуменне задання, уменне аналізаваць , лагічна будаваць выказванні, вырашаць праблемы ў камандзе.

4.Пасля выканання кожнага задання вы павінны агучыць вывад.

(*Пад музыку песні " Дарогаю Дабрыні" дзеці едуць да першага пункту, шлях да якога ўказаны у маршрутным лісце* (Дадатак 1))

**Першы пункт "Пазнай- ка"**
**Заданне:** Праглядзіце відэасюжэт і знайдзіце памылку. Растлумачце свой выбар.
*(**Вывад:** Калі хочаш, каб людзі добра адносіліся да цябе, значыць, ты сам у першую чаргу павінен быць добрым, уважлівым, міласэрным. Увесь час імкнуцца рабіць добрыя справы)*

**Другі пункт "Успамінай – ка"**

**Заданне:** На «Дрэве міласэрнасці» ёсць пропускі – "белыя плямы". Ваша задача – іх запоўніць. Запішыце на далоньках, якія добрыя справы зрабілі менавіта вы і да каго праявілі міласэрнасць?

*(**Вывад:** Дапамагаць людзям мы вучымся з дзяцінства. Нельга быць абыякавым да чужога гора, трэба заўсёды памятаць, што чалавек жыве адзін раз на Зямлі, таму трэба кожны дзень рабіць дабро і быць памяркоўным да ўсіх, хто нас акружае).*

**Трэці пункт " Збірай-ка"**
**Заданне**: Вам патрэбна скласці прыказкі і абмеркаваць у камандзе іх сэнс (*выконваюць заданне*)
Пра добрыя справы гавары смела.
Жыццё дадзена на добрыя справы.
За дабро дабром плаці.
Як аукнецца, так і адклікнецца.

Добрае слова, што дождж у засуху.
Дабро тварыць — сябе весяліць.

Добры чалавек дабру вучыць.
Добрае слова лечыць, а злое калечыць
Не адзенне ўпрыгожвае чалавека, а яго добрыя справы.
Добрая слава ляжыць, а кепская бяжыць.

*(**Вывад**: Мы ведаем , што прыказкі стварыў народ. Гэта яго мудрасць. Яны вучаць нас рабіць дабро кожную хвіліну, дапамагаць таму, каму патрэбна наша дапамога)*

**Чацвёрты пункт "Мадэліруй-ка"**

**Заданне:** У куфэрку знаходзяцца розныя прадметы.Вам небходна выбраць любы з іх і прапанаваць сітуацыі, у якіх пры дапамозе гэтага прадмета можна здзейсніць справы міласэрнасці.

*(для адной каманды – кніга, кветка, паштовы канверт , зерне;
для другой каманды – віншавальная паштоўка, цацка, светаадлюстроўваючы элемент, насенне кветак)*

*(**Вывад:** міласэрнасць павінна быць актыўнай, выяўленая ў дзеянні, таму можна тысячу разоў казаць пра тое, што шкада старых, але ніколі не саступаць месца ў транспарце пажылым людзям, казаць гучныя словы пра абарону прыроды, але не заўважаць урны для смецця, аказваць дапамогу малодшым , але пры гэтым лічыць, што ты дужэйшы)*

**Пяты пункт "Разважай-ка"**

**Заданне:** Прачытайце сітуацыі і абмяркуйце ў групах, а як бы вы паступілі?

*Сітуацыя №1*

Сям'я праводзіла выхадны дзень на пляжы. Дзеці купаліся ў моры і будавалі замкі на пяску. Раптам удалечыні паказалася маленькая бабулька. Яе сівыя валасы выбіваліся з-пад хусткі і трапяталіся на вятры, адзенне было бруднае і абарванае. Яна нешта прагаварвала пра сябе, падбіраючы з пяску нейкія прадметы і кладучы іх у сумку. Бацькі паклікалі дзяцей да сябе і загадалі ім трымацца далей ад бабулькі. Праходзячы міма, раз-пораз нагінаючыся, каб нешта падняць, яна ўсміхнулася сям'і, але ніхто не адказаў ёй на прывітанне. Праз некалькі тыдняў сям'я даведалася, што маленькая бабулька ўсё жыццё прысвяціла таму, каб падбіраць з пляжа асколкі шкла, якімі дзеці маглі б парэзаць сабе ногі.

*Сітуацыя №2*

Аднойчы брат з сястрой выйшлі ў двор пагуляць у валейбол. Яны весела перакідвалі адзін аднаму мяч і гучна смяяліся. А недалёка ад дзіцячай пляцоўкі ў інвалідным крэсле, з сумнымі вачыма, самотна сядзеў хлопчык Пеця. У руках у яго таксама быў мячык. Ён марыў таксама бегаць па мяккай траве, падкідваць і лавіць мяч. А дзеці радасна гулялі паміж сабой у мяч і нікога вакол сябе не заўважалі. Ім было абыякава, што адчувае хлопчык, прыкаваны да інваліднага крэсла. Галоўнае, што ім самім было добра і весела.

*(Вывад: Мы бачым, што жыццё ўвесь час дае нам шанс стаць на дарогу дабрыні і міласэрнасці і ісці па ёй).*

**3. Рэфлексія**
**Дзіма:**

Наш квэст завершаны. Каманды прайшлі ўсе пункты і справіліся з заданнямі. У кожнай каманды ёсць атрыманыя пазлы. Складзіце іх, і вы разгадаеце інтрыгу(*складаюць пазлы*).

У нас з вамі атрымалася карта нашай маленькай радзімы- Карэліцкага раёна з нашымі добрымі справамі. Мы – яе бучыня, і наперадзе нас чакае яшчэ многа слаўных спраў. А на што здольныя вы, каб зрабіць нашу Радзіму прыгожай, квітнеючай.

Вось я…..

**Калі б я быў ветрам*, то ...

* Калі б я быў зоркай, то ...

* Калі б я быў морам, то ...

* Калі б я быў лесам, то ...

Калі б я быў кветкай, то

* Калі б я быў доктарам, то ...

*Калі б я быў чараўнікам, то ...

* Калі б я быў выратавальнікам, то ...

* Калі б я быў вынаходнікам, то ...

* Калі б я быў настаўнікам,то…

* Калі б я быў дарогай , то…

**Настаўнік:** А я сёння хачу падзякаваць усім за цёплую даверлівую размову, за добрыя, разумныя думкі, за творчыя адносіны да работы. Народная мудрасць кажа:
"Шчасця дасягае той, хто імкнецца зрабіць шчаслівым другіх".

## Інструкцыя для каманды " Кропелькі міласэрнасці"

**Першы пункт " Пазнай-ка"**

Заданне знаходзіцца ў кнізе, якую кожны год 1 верасня Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь дорыць першакласнікам. Кніга знаходзіцца ў ніжняй трэцяй шафе ад дзвярэй.

**Другі пункт" Успамінай-ка"**

На падаконніку ў вазе стаіць кветка, якая з'яўляецца сімвалам Беларусі.Заданне знойдзеце ў вазе.

**Трэці пункт "Збірай-ка"**

У беларусаў ёсць звычай сустракаць гасцей хлебам – соллю. Знайдзіце рэч, якая з'яўляецца неад'емнай часткай гэтай традыцыі.Заданне пад гэтай рэччу.

**Чацвёрты пункт "Мадэліруй-ка"**

Гэта рэч упрыгожана і аздоблена пры дапамозе традыцыйнага для беларускіх рамёстваў матэрыяла. Матэрыял гэты збіралі ўлетку ў час жніва.
Заданне ў ёй.

**Пяты пункт "Разважай-ка"**

Заданне знаходзіцца ў кнізе ”Вялікія і славутыя людзі зямлі беларускай” на старонцы пра беларускага першадрукара. Кніга на паліцы  другой  шафы ад акна.

## Інструкцыя для каманды “ Праменьчыкі надзеі”

**Першы пункт   “ Пазнай-ка”**

Заданне знаходзіцца ў другой  шафе ад акна ў кнізе ” Сімволіка Беларускай дзяржавы.”

**Другі пункт  “ Успамінай-ка”**

Сярод фотаздымкаў птушак, знайдзіце той, на якім адлюстравана птушка- сімвал Беларусі. Фотаздымкі на настаўніцкім стале.Там і заданне .

**Трэці пункт “Збірай-ка”**

Максім Багдановіч у сваім вершы пісаў:
Цямнее край зубчаты бору…
І тчэ, забыўшыся , рука
Заміж персідскага ўзору
Цвяток Радзімы васілька.
Знайдзіце рэч, пра якую пісаў паэт.
Заданне перавязана ім.

**Чацвёрты пункт “Мадэліруй-ка”**

Гэта рэч зроблена з дрэва і ўпрыгожана разьбою беларускага майстра. Адшукайце рэч і знайдзіце ў ім заданне.

**Пяты пункт” Разважай-ка”**

Заданне знаходзіцца ў кнізе ”У гасцях у вечнасці” на старонцы пра Крэўскі замак.Кніга на паліцы  чацвёртай шафы ад акна.

**Заданні для каманды “ Праменьчыкі надзеі”**
**Першы пункт « Пазнай- ка ».**
**Заданне:** Праглядзіце відэасюжэт і знайдзіце памылку. Растлумачце свой выбар.
**Другі пункт «Успамінай – ка ».**

**Заданне:** На  «Дрэве міласэрнасці»  ёсць пропускі – “белыя плямы”. Ваша задача- іх запоўніць .Запішыце на далоньках, якія  добрыя справы  менавіта вы зрабілі, да каго праявілі міласэрнасць.

**Трэці пункт “ Збірай-ка”**

**Заданне**:  Вам патрэбна скласці прыказкі і абмеркаваць у камандзе сэнс гэтых прыказак. (выконваюць тэст, створаны па праграме SMART)

**Чацверты пункт “Мадэліруй-ка”**

Заданне: У куфэрку знаходзяцца розныя прадметы.Вам небходна выбраць любы з іх і прапанаваць сітуацыі ,у якіх пры дапамозе гэтага прадмета можна здзейсніць добрыя справы.

**Пяты пункт “Развражай-ка”**

Заданне : Прачытайце сітуацыю і абмяркуйце ў групах, а як бы вы паступілі?

*Сітуацыя*

Сям'я праводзіла выхадны дзень на пляжы. Дзеці купаліся ў моры і будавалі замкі на пяску. Раптам удалечыні паказалася маленькая бабулька. Яе сівыя валасы выбіваліся з-пад хусткі і трапяталіся на вятры, адзенне было бруднае і абарванае. Яна нешта прагаварвала пра сябе, падбіраючы з пяску нейкія прадметы і кладучы іх у сумку. Бацькі паклікалі дзяцей да сябе і загадалі ім трымацца далей ад бабулькі. Праходзячы міма, раз-пораз нагінаючыся, каб нешта падняць, яна ўсміхнулася сям'і, але ніхто не адказаў ёй на прывітанне. Праз некалькі тыдняў сям'я даведалася, што маленькая бабулька ўсё жыццё прысвяціла таму, каб падбіраць з пляжа асколкі шкла, якімі дзеці маглі парэзаць сабе ногі.

Заданні для каманды "Кропелькі міласэрнасці"

**Першы пункт « Пазнай- ка ».**
**Заданне:** Праглядзіце відэасюжэт і знайдзіце памылку. Растлумачце свой выбар.
**Другі пункт «Успамінай – ка ».**

**Заданне:** На « Дрэве міласэрнасці » ёсць пропускі – "белыя плямы". Ваша задача- іх запоўніць .Запішыце на далоньках, якія добрыя справы менавіта вы зрабілі, да каго праявілі міласэрнасць.

**Трэці пункт " Збірай-ка"**
**Заданне**: Вам патрэбна скласці прыказкі і абмеркаваць у камандзе сэнс гэтых прыказак. (выконваюць тэст, створаны па праграме SMART)

## Чацверты пункт “Мадэліруй-ка”

Заданне: У куфэрку знаходзяцца розныя прадметы.Вам небходна выбраць любы з іх і прапанаваць сітуацыі ,у якіх пры дапамозе гэтага прадмета можна здзейсніць добрыя справы.

## Пяты пункт “Разважай-ка”

Заданне : Прачытайце сітуацыю і абмяркуйце ў групах, а як бы вы паступілі?

*Сітуацыя*

Аднойчы брат з сястрой выйшлі ў двор пагуляць у валейбол. Яны весела перакідвалі адзін аднаму мяч і гучна смяяліся. А недалёка ад дзіцячай пляцоўкі ў інвалідным крэсле, з сумнымі вачыма, самотна сядзеў хлопчык Пеця. У руках у яготаксамабыўмячык. Ёнмарыўтаксамабегаць па мяккай траве, падкідваць і лавіць мяч. А дзеціpадаснагуляліпаміжсабойу мяч і нікогаваколсябе не заўважалі. Ім было абыякава, штоадчуваехлопчык, прыкаваны да інваліднагакрэсла. Галоўнае, штоімсамім было добра і весела.

**Ацэначны ліст каманды “Кропелькі міласэрнасці”**

| Заданне | Адзнака аб выкананні |
|---|---|
| 1.Праглядзіце відэасюжэт і знайдзіце памылку. Растлумачце свой выбар. | |
| 2.На «Дрэве міласэрнасці» ёсць пропускі – “белыя плямы”. Ваша задача – іх запоўніць.<br>Запішыце на далоньках, якія добрыя справы зрабілі менавіта вы і да каго праявілі міласэрнасць? | |

| | |
|---|---|
| | |
| 3.Вам патрэбна скласці прыказкі і абмеркаваць у камандзе сэнс гэтых прыказак. (выконваюць тэст) | |
| 4.У куфэрку знаходзяцца розныя прадметы.Вам небходна выбраць любы з іх і прапанаваць сітуацыі ,у якіх пры дапамозе гэтага прадмета можна здзейсніць добрыя справы. | |
| 5.Прачытайце сітуацыю і абмяркуйце ў групах, а як бы вы паступілі? | |

## Ацэначны ліст  каманды “Праменьчыкі надзеі”

| Заданне | Адзнака аб выкананні |
|---|---|
| 1.Праглядзіце відэасюжэт і знайдзіце памылку. Растлумачце свой выбар. | |
| 2.На «Дрэве міласэрнасці» ёсць пропускі – “белыя плямы”.<br>Ваша задача – іх запоўніць. Запішыце на далоньках, якія добрыя справы зрабілі менавіта вы і да каго праявілі міласэрнасць? | |
| 3.Вам патрэбна скласці прыказкі і абмеркаваць у камандзе сэнс гэтых прыказак. (выконваюць тэст) | |

| | |
|---|---|
| | |
| 4.У куфэрку знаходзяцца розныя прадметы. Вам небходна выбраць любы з іх і прапанаваць сітуацыі ,у якіх пры дапамозе гэтага прадмета можна здзейсніць добрыя справы. | |
| 5.Прачытайце сітуацыю і абмяркуйце ў групах, а як бы вы паступілі? | |